# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Зяноўка Яўгеніі Сяргееўны
«Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі»,
прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка

Сучасная навуковая парадыгма паставіла перад лінгвістамі складаную задачу, звязаную з даследаваннем мовы на службе чалавека, дзеля пазнання свету, у выніку чаго мовазнаўчая навука пачынае займаць трывалае месца ў сістэме чалавеказнаўства, а суадносіны "мова і чалавек", "мова і спосабы асваення чалавекам навакольнай рэчаіснасці" разглядаюцца як галоўныя элементы любой этнамоўнай культуры. У сувязі з гэтым назіраецца пільная ўвага да адной з самых актуальных праблем сучаснай лінгвістычнай навукі – да праблемы надання штучнаму інтэлекту якаснага літаратурнага маўлення на беларускай мове. У час тэхнічных інавацый пасяховае выкананне задач па стварэнні і прымяненні маўленчых тэхналогій немагчыма без узаемадзеяння і сумеснай працы спецыялістаў лінгвістычнага і тэхнічнага профілю.

Праведзенае Яўгеніяй Сяргееўнай Зяноўка даследаванне прысвечана міжгаліноваму вывучэнню і аптымізацыі лінгваакустычных рэсурсаў у сістэмах сінтэзу маўлення з улікам рытміка-меладычнай структуры беларускай літаратурнай мовы. Актуальнасць даследавання вызначаецца практычнай скіраванасцю лінгваакустычных рэсурсаў беларускай літаратурнай мовы для існуючых беларускамоўных сістэм маўлення па тэксце.

Актуальнасць тэмы дысертацыі вызначаецца таксама неабходнасцю распрацоўкі механізмаў і сродкаў для дасканалага функцыянавання прасадычнага працэсара ў машынных сістэмах, дзе інтанацыя адказвае за якасную арганізацыю маўлення. Актуальнасць работы ўзмацняецца і тым, што стварэнне і рэалізацыя лінгваакустычнай базы даных у складзе камп'ютарных сістэм з акустычным кампанентам прыбліжае працэс надання натуральнага гучання штучнаму маўленню. Аўтар знаёмая са спецыяльнай літаратурай па тэме даследавання і мае ўласныя адказы на яшчэ не вырашаныя пытанні, звязаныя з праблемай якаснага сінтэзу маўлення на беларускай мове, якая застаецца распрацаванай толькі часткова.

Навуковая навізна вынікаў дысертацыйнага даследавання Я. С. Зяноўка заключаецца ў тым, што ўпершыню вызначаны прасадычныя характарыстыкі

беларускай літаратурнай мовы, якія атрыманы з прымяненнем сучасных камп'ютарных праграм Sony Sound Forge, Praat, PitchPlotter па вывучэнні інтанацыі. Акрамя таго, упершыню ў айчынным мовазнаўстве з апорай на сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі распрацаваны лінгваакустычныя рэсурсы, якія характарызуюць рытміка-меладычную арганізацыю беларускай мовы ў складзе сістэм сінтэзу маўлення. Праведзеная ў дысертацыі праграмная апрацоўка агучанага матэрыялу адлюстроўвае інтанацыйныя параметры літаратурнага маўлення, прыдатныя для ўбудавання ў камп'ютарныя сістэмы. Распрацаваны беларускамоўны модуль «IntonTrainer», у аснову якога пакладзена аўтарская лінгваакустычная база даных, прапаноўвае тыповыя інтанацыйныя мадэлі, якія вызначаны з улікам сінтаксічнай структуры і камунікатыўнага тыпу сказаў, знакаў прыпынку і іх эмацыянальнай афарбаванасці.

У адпаведнасці з мэтай і задачамі даследавання ў дысертацыі сфармуляваны асноўныя палажэнні, вынесеныя на абарону, якія навукова абгрунтаваныя, падпарадкаваны асноўнай мэце работы і пацвярджаюцца яе зместам. Змест праведзенага даследавання адпавядае вызначаным мэце і задачам, якія вырашаюцца з дастатковай паўнатой і дакладнасцю.

Дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у даследаванні, забяспечваецца кваліфікаванай апрацоўкай вялікага аб'ёму фактычнага матэрыялу (1000 камунікатыўна-сінтаксічных адзінак (сказаў-ілюстрацый)). У гэтым плане таксама заслугоўвае ўвагі праведзены сярод беларускамоўных носьбітаў эксперыментальны аналіз суперсегментных адзінак, які пацвердзіў высновы аб найбольш верагоднай лакалізацыі меж сінтагм у тэксце.

Работа грунтуецца на дастаткова значнай колькасці крыніц (211 пазіцый), што дазваляе аўтару дысертацыі зрабіць абгрунтаваныя вывады, якія з'яўляюцца пераканальным доказам асноўных палажэнняў, вынесеных на абарону. Адным з каштоўных вынікаў даследавання з'яўляецца праграмная апрацоўка 29 тэхналагічных мадэлей, што рэалізуюцца на аснове распрацаваных фармальных правіл і граматыкі, якія адказваюць за лінгвістычную напаўняльнасць камп'ютарных сродкаў. Менавіта лінгваакустычныя рэсурсы з'яўляюцца неабходным складнікам у новай беларускамоўнай сістэме сінтэзу маўлення па тэксце на аснове нейронных сетак, што зроблена ўпершыню ў беларускай навуцы.

Пры агульнай станоўчай ацэнцы даследавання хацелася б атрымаць удакладненне: ці праводзілася дадатковая дыферэнцыяцыя фактычнага матэрыялу, які загружаецца ў розныя сістэмы (350 адзінак – для тэсціравання БСМТ; 300 – для стварэння беларускамоўнага модуля па даследаванні інтанацыйных асаблівасцей у праграмным комплексе «IntonTrainer»; 350 –

для распрацоўкі алгарытму па вызначэнні інтанацыйных меж сінтагм у праграмным комплексе NooJ).

Мяркуючы па аўтарэфераце, неабходна падкрэсліць, што дысертацыя Я. С. Зяноўка з'яўляецца арыгінальным навуковым даследаваннем, у якім на высокім навуковым узроўні вырашаюцца пастаўленыя задачы. Атрыманыя вынікі дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца ў навукова-даследчай дзейнасці пры распрацоўцы тэарэтычных і прыкладных праблем сучаснай беларускай прасодыі; у вучэбна-метадычнай рабоце пры чытанні курсаў і спецкурсаў па камп'ютарнай і корпуснай лінгвістыцы; пры выкладанні вучэбных дысцыплін па фанетыцы беларускай мовы, а таксама праблемах штучнага інтэлекту і камп'ютарных тэхналогій у ВНУ.

У сувязі з гэтым лічу, што аўтар дысертацыі «Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі» Яўгенія Сяргееўна Зяноўка заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка.

Загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі,
кандыдат філалагічных навук
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры
і мастацтваў» А. М. Пісарэнка

30 красавіка 2025 года

Подлинность подписи удостоверяю
30.04.2025